# ЗАКАНАДАЎЧЫЯ АСНОВЫ ДЗЕЙНАСЦІ СІРОЦКІХ СУДОЎ НА БЕЛАРУСКІХ ЗЕМЛЯХ У КАНЦЫ XVIII – ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX ст.

***К. Р. Кімбар***

*Дзяржаўная навуковая ўстанова «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», вул. Акадэмічная, 1, 220072, г. Мінск, Беларусь, katsyaryna. kimbar@yandex.ru*

Разгледжана эвалюцыя заканадаўства Расійскай імперыі, якое рэгулявала дзейнасць сіроцкіх судоў і дзейнічала на беларускіх землях у канцы XVIII – першай палове XIX стст. На аснове заканадаўчай базы вызначаны паўнамоцтвы і месца органа ў судовай сістэме, правілы ўсталявання апекі над асобамі з саслоўя гарадскіх абывацеляў і іх маёмасцю.

***Ключавыя словы:*** беларускія землі; заканадаўства; гарадскія абывацелі; апека; сіроцкія суды.

# ЗАКОНОДАТЕЛЬНЫЕ ОСНОВЫ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ СИРОТСКИХ СУДОВ НА БЕЛАРУСКИХ ЗЕМЛЯХ В КОНЦЕ XVIII – ПЕРВОЙ ПОЛОВИНЕ XIX ВВ.

***Е. Г. Кимбор***

*Государственное научное учреждение «Институт истории Национальной академии наук Беларуси», ул. Академическая, 1, 220072, г. Минск, Беларусь, katsyaryna. kimbar@yandex.ru*

Рассмотрена эволюция законодательства Российской империи, регулировавшее деятельность сиротских судов и действовавшее на белорусских землях в конце XVIII – первой половине XIX вв. На основе законодательной базы определены полномочия и место органа в судебной системе, правилы учреждения опеки над лицами из сословия городских обывателей и их имуществом.

***Ключевые слова***: территория Беларуси; законодательство; городские обыватели; опека; сиротские суды.

# LEGISLATIVE BASE FOR THE ACTIVITY OF ORPHAN COURTS IN THE BELARUSIAN GOVERNORATES AT THE END OF THE 18TH - THE FIRST HALF OF THE 19TH CENTURIES.

***K. R. Kimbar***

*State scientific institution «The Institute of History of The National Academy of Sciences of Belarus», Akademičnaja street, 1, 220072, Minsk, Belarus, katsyaryna. kimbar@yandex.ru*

The evolution of the legislation of the Russian Empire, which regulated the activities of orphan courts and operated in the Belarusian  governorates at the end of the 18th - the first half of the 19th centuries, is considered. On the basis of the legislative framework, the powers and place of this institution in the judicial system, the rules for establishing guardianship over persons from the urban estate and their property are determined.

***Keywords***: Belarusian governorates; legislation; urban estate; guardianship; orphan courts.

Заканадаўчыя нормы, якія рэгулявалі апеку над сіротамі і ўдовамі, пачалі распрацоўвацца ў Расійскай імперыі ў канцы XVIII ст. Гэтае заканадаўства стала дзейнічаць і на беларускіх землях пасля іх далучэння да Расійскай імперыі ў выніку падзелаў Рэчы Паспалітай. Для апекавання над удовамі і сіротамі з саслоўя гарадскіх абывацеляў у Расійскай імперыі паводле «Учреждений для управления губерний Всероссийской империи» 4 лістапада 1775 г. ствараліся сіроцкія суды. Як гаварылася ў дакуменце, «…В городовом Сиротском Суде председает Городской Глава и заседают два Члена Городового Магистрата, и Городовый Староста» [1, с. 232]. Цалкам сіроцкім судам была прысвечана глава XXI «Учреждений». Паводле дакумента, сіроцкі суд мусіў засноўвацца пры кожным гарадавым магістраце для апекі над купецкімі і мяшчанскімі ўдовамі і сіротамі [1, с. 261]. Законам не ўсталёўвалася перыядычнасць пасяджэнняў сіроцкага суда, а агаворвалася, што «будучи всегда на лицо, может заседать, когда дело будет» – такім чынам, колькасць пасяджэнняў не абмяжоўвалася. Сіроцкія суды падпарадкоўваліся губернскім магістратам і штогод давалі ім справаздачы пра становішча маёмасці пад апекай у горадзе. Абскардзіць рашэнне сіроцкіх судоў можна было таксама ў губернскім магістраце [1, с. 262–263].

Тэкст закона пра ўсталяванне апекі сіроцкім судом вельмі падобны на апісанне дзейнасці дваранскіх апек (аналагічных па функцыях органаў, але створаных для дваранскага саслоўя) у XVI главе «Учреждений о губерниях» [1, с. 247–251]. Для таго, каб сіроцкі суд усталяваў апеку, трэба было хадайніцтва зацікаўленага боку: гарадскага главы, удавы, бліжэйшых сваякоў малалетніх сірот або сведчанне двух пабочных асоб і прыходскага святара (які павінен быў паведамляць сіроцкаму суду пра тых жанчын і дзяцей, якія згубілі кармільца і засталіся без апекі ў яго прыходзе). Таксама ініцыятарамі апекі маглі выступаць дзяржаўныя інстанцыі: губернскае праўленне, палаты суда, губернскі магістрат або іншая судовая ўстанова [1, с. 261].

Удовам з саслоўя гарадскіх абывацеляў сіроцкія суды абавязваліся прадстаўляць іх інтарэсы ў іншых дзяржаўных інстанцыях, гарантавалі ім бясплатныя паслугі страпчых і імкнуліся «доставить принадлежащее им имение движимое и недвижимое, как то дворы, лавки, фабрики и тому подобное». Сіроцкія суды вырашалі і дакладвалі губернскаму магістрату, ці будуць удава і яе дзеці жыць разам ці асобна. Можна меркаваць, што такія

рашэнні прымаліся ў выпадках асобнага валодання маёмасцю, у тым ліку нерухомай. Калі ж удава не мела маёмасці ва ўласнасці, сіроцкі суд мусіў для яе «доставить пристанище и пропитание, или работу приличную […] состоянию». Пры жаданні ўдавы ёй прызначаўся папячыцель з купцоў ці мяшчан «для совета и защиты во всех ее делах» [1, с. 262].

Працэдура ўсталявання апекі над сіротамі пачыналася з таго, што сіроцкі суд «осведомляется об имении малолетнаго». Калі маёмасць існавала, сіроцкі суд прызначаў апекуноў [1, с. 261]. Адметна, што апека з боку сіроцкіх судоў па заканадаўстве ўсталёўвалася ў першую чаргу над маёмасцю ў мэтах яе захавання, а не над асобай дзіцяці-сіраты. Дзецьмі-сіротамі з саслоўя гарадскіх абывацеляў, якія не мелі маёмасці, павінен быў займацца прыказ грамадскай апекі і яго ўстановы, такія як сіроцкія прытулкі. Ва «Учреждениях о губерниях» прапісвалася таксама другое рашэнне: «Буде же малолетный остался без всякаго имения, тогда Городовый Сиротский Суд старается поместить малолетнаго по состоянию его или в общественных для сирых училищах, или у доброхотных людей, дабы научился науке, или промыслу, или ремеслу, и доставлен был ему способ учиниться добрым гражданином» [1, с. 262].

Перш за ўсё, апекунамі сірот з саслоўя гарадскіх абывацеляў павінны былі стаць тыя асобы, каго вызначылі ў сваім духоўным тэстаменце памерлыя бацькі сіраты. Калі ў тэстаментах не было адпаведных распараджэнняў, то апекуноў прызначалі менавіта сіроцкія суды. На месца апекуна маглі прэтэндаваць як сваякі, так і пабочныя асобы для малалетніх сірот, «кои добродетельными качествами, честностию и незазорным поведением более подают надежды к призрению малолетнаго в здравии, добронравном воспитании и достаточном содержании по его состоянию, и от которых отеческаго попечения к малолетному ожидать непременно можно» [1, с. 261]. У арт. 300 гл. XXI «Учреждений о губерниях» пералічвалася, каго апекунамі прызначаць нельга: тых, хто растраціў свой або бацькоўскі маёнтак, банкрота купца або мешчаніна, асоб, вядомых свамі заганамі, ці тых, хто знаходзіўся пад судовым пакараннем, а таксама тых, хто меў сваркі з бацькамі малалетніх сірот [1, с. 262].

Пасля прызначэння апекуноў сіроцкія суды загадвалі ім пры ўдзеле сакратара гарадавога магістрата і двух пабочных сведкаў зрабіць падрабязны вопіс усёй маёмасці, якая засталася ад памерлых у спадчыну сіраце. Адна копія вопісу з усімі подпісамі перадавалася ў сіроцкі суд, а другую пакідаў сабе апякун. Сіроцкі суд мусіў назіраць за тым, як адбываецца кіраванне маёмасцю малалетніх сірот і зацвярджаць штогод

справаздачы ад апекуноў. Калі апекуны настойвалі на неабходнасці прадаць пэўную частку нерухомай маёмасці малалетняга сіраты, каб заплаціць па пазыках, сіроцкія суды павінны былі паведаміць пра гэта «с своим мнением» губернскаму магістрату, які і выносіў рашэнне аб продажы [1, с. 261–262].

У арт. 305 гл. XXI «Учреждений о губерниях» у 17 пунктах былі прапісаны правілы для апекуноў – «Примерное, или повальное наставление опекунам». Пры гэтым большая частка пунктаў (№ 2, 6, 7–14) артыкула тычылася кіравання маёмаснымі і фінансавымі справамі малалетніх сірот, што пацвярджае прыярытэт апекі над маёмасцю. Паводле «Наставления», апякун абавязваўся захоўваць у цэласці маёмасць, перададзеную яму па вопісе, весці ўлік прыходам і расходам у адпаведных кнігах, сачыць за правільным вядзеннем гандлю, промыслаў ці іншых спраў, якія перайшлі ў спадчыну дзецям-сіротам ад памерлых бацькоў.

Калі ў спадчыну сіраце пераходзілі заводы ці фабрыкі, апякун павінен быў не толькі клапаціцца пра іх прыбытковасць, але выплочваць дзяржаўныя зборы і імкнуцца захоўваць колькасць працаўнікоў (сялян або наёмных рабочых) на прадпрыемствах. Апякун адказваў за рамонт будынкаў і дарог. Ён кантраляваў дзейнасць прыказчыкаў і старастаў на прадпрыемствах, адхіляў ад працы тых, хто быў заўважаны «в непорядках, или утрате хозяйскаго». На апекуна ўскладаўся абавязак спаганяць пазыкі з даўжнікоў і плаціць па ўласных займах (па магчымасці) з грашовага абарачэння ў гандлі ці на прадпрыемстве малалетніх сірот. Капіталы малалетніх сірот у «Наставлении» рэкамендавалася аддаць пад працэнты «на верныя векселя, или закладныя» або пусціць у абарот у гандлёвых ці прамысловых справах. Апякун таксама мусіў прадстаўляць інтарэсы сіраты ў розных судовых установах [1, с. 263–264].

Непасрэдна пытанне апекі над асобай сіраты закраналася ў 5 пункце 305 арт. гл. XXI «Учреждений». У ім дакладна гаварылася, што выхаванне сіраты было прэрагатывай апекуна толькі ў выпадку, калі той «не помещен в общественных для городовых жителей училищах» [1, с. 263]. Забяспечваць дзяцей-сірот фінансава трэба было без лішніх выдаткаў, але крыніцы забеспячэння не былі дакладна акрэслены: «…содержание же малолетнаго расположить по его имуществу». Мэтамі выхавання былі як развіццё ў дзіцяці ўсемагчымых дабрадзейных якасцяў, так і навучанне рамяству, якое б адпавядала яго саслоўю [1, с. 263].

Апякун павінен быў штогадова дасылаць справаздачы ў сіроцкі суд пра прыбыткі і выдаткі ў маёмасці малалетніх сірот, а таксама пра іх

забеспячэнне і выхаванне. Апошнюю справаздачу трэба было прадаставіць у год паўналецця падапечных (у Расійскай імперыі з 17 гадоў можна было ўступаць ва ўладанне маёнткам і іншай маёмасцю [2, с. 42]) – тады апека спынялася. За сваю працу апякун атрымліваў 5% з даходаў малалетняга сіраты штогадова. Калі ж апекуноў было некалькі, гэтая сума дзялілася паміж імі [1, с. 264–265].

Функцыянаванне сіроцкіх судоў было замацавана ў «Грамоте на права и выгоды городам Российской империи» ад 21 красавіка 1785 г. У дакуменце рабілася спасылка на 31, 294, 297 артыкулы «Учреждений о губерниях» і паўтараліся палажэнні пра склад і функцыі сіроцкіх судоў [3, с. 362]. У артыкуле 123 «Грамоты…», які змяшчаў «Ремесленное положение», у пункце 18 гаварылася: «Управный Старшина и Старшинские товарищи […] о вдовах же и малолетных уведомляют Городскаго Главу» [3, с. 370–371]. Такім чынам, быў дапоўнены спіс асоб, хто быў абавязаны паведамляць гарадскім уладам пра дзяцей і жанчын у горадзе, якія засталіся без апекі.

З 1801 г. сіроцкія суды замест скасаваных губернскіх магістратаў сталі падпарадкоўвацца палатам грамадзянскага суда [4]. Паводле ўказа ад 31 студзеня 1816 г., у палаты трэба было падаваць справаздачы з дваранскіх апек і сіроцкіх судоў штогод у студзені [5]. У першай палове XIX ст. адбывалася пашырэнне паўнамоцтваў сіроцкіх судоў. З 1822 г. у іх ведамства павінны былі паступаць маёмасць сірот і ўдоў «мастеровых людей» з казённых заводаў і фабрык, якія знаходзіліся ва ўтрыманні прыватных асоб. Прычым у апекуны трэба было выбіраць адну асобу па меркаванні сіроцкага суда, а другую – з боку ўтрымальніка фабрыкі [6]. Згодна з указам ад 23 студзеня 1828 г., пад апеку сіроцкіх судоў паступала таксама секвестраваная маёмасць асоб з саслоўя гарадскіх абывацеляў [7]. Гэта было пацверджана ў «Высочайше утвержденном Положении о порядке описи, оценки и публичной продажи имуществ»: «Если у владельца описано недвижимое имение сполна или частию для удовлетворения исков казенных; то оное до продажи поступает в заведывание Опеки или Сиротскаго Суда, смотря по званию владельца» [8, с. 443]. А паводле ўказа ад 12 красавіка 1833 г., пад апеку траплялі фабрыкі, на якіх пасля смерці ўладальніка ўзнікалі спрэчкі паміж спадкаемцамі. Калі хаця б адзін з магчымых спадкаемцаў быў непаўналетні, фабрыка часова пераходзіла пад апеку сіроцкага суда [9].

У большай частцы заканадаўчых актаў, якія тычыліся сіроцкіх судоў, гаворка ішла пра апеку над дзецьмі, удовамі і маёмасцю мяшчан і купцоў.

Але ў заканадаўстве было вызначана, да якой інстанцыі мусілі звяртацца сіроты – дзеці асабістых дваран. Асабістае дваранства можна было атрымаць за пэўныя заслугі, але па спадчыне яно не перадавалася. Таму ва ўказе ад 29 красавіка 1818 г. гаварылася: «…как дети личных Дворян принадлежат к классу разночинцов, то избрание к ним опекунов, следуя общему правилу, из числа родственников их или посторонних предоставить Сиротским Судам» [10, с. 221]. Аднак, калі дзецям па спадчыне пераходзіла маёмасць, якой яны (па саслоўных правілах) не мелі права валодаць (напрыклад, маёнткі з прыгоннымі сялянамі), то такая маёмасць да яе продажу пераходзіла пад апеку дваранскіх апекуноў, якіх прызначалі дваранскія апекі. Гэта пацвярджала, што ў расійскім праве паняцці апекі над маёмасцю і апекі над асобай былі падзелены. У дадзеным выпадку яны не супадалі і падлягалі розным інстытуцыям: апека над маёмасцю дзяцей-сірот асабістых дваран – дваранскім апекам, а над самімі дзецьмі – сіроцкім судам.

У кадыфікаваны Звод законаў Расійскай імперыі 30-х гг. XIX ст. увайшлі палажэнні, якія рэгулявалі дзейнасць як сіроцкіх судоў, так і прызначаных імі апекуноў. У «Зводзе законаў» 1835 г. выдання правілы апекі над непаўналетнімі былі змешчаны ў кнігу «О правах и обязанностях семейственных» – раздзел III «Об опеке и попечительстве в порядке семейственном», у першую главу – «Об опеке и попечительстве над несовершеннолетними» (I частка X тома «Законы гражданские»). У «Зводзе законаў» былі зафіксаваныя агульнасаслоўныя нормы: узрост паўналецця, правы непаўналетніх на карыстанне маёмасцю, правілы прызначэння апекуноў, правілы дзейнасці апекуноў на сваёй пасадзе (арткк. 159–177, 183, 187–193, 196–213) [11, с. 43–56]. Спецыфічнымі для саслоўя гарадскіх абывацеляў выступалі нормы, у якіх было акрэслена, што сіроцкія суды займаліся апекай над дзецьмі асабістых дваран, гарадскіх абывацеляў наогул і «мастеровых людей» казённых заводаў і фабрык, якія знаходзіліся ў прыватным уладанні (артк. 179, 181, 184) [11, с. 47–48].

Глава II «Учреждение Сиротскаго Суда при Городовом Магистрате» (раздзел III «Учреждение судебнаго управления в городе» IV кнігі 2 часткі II тома «Свод учреждений государственных и губернских») ўключала ў сябе палажэнні пра абавязкі, склад, месца ў судовай іерархіі сіроцкіх судоў (артк. №№ 1010–1015) [12, с. 248–249]. У пазнейшых рэдакцыях «Звода законаў» (1842 г., 1857 г. ) змест палажэнняў, якія датычыліся працы сіроцкіх судоў, па сутнасці не змяніўся, але нумарацыя артыкулаў не захавалася.

Такім чынам, першапачатковым этапам у фарміраванні заканадаўства, якое рэгулявала дзейнасць сіроцкіх судоў, стала прыняцце ў 1775 г. акта «Учреждений для управления губерний Всероссийской империи». Паводле яго, сіроцкія суды засноўваліся як гарадскія інстытуты апекі над дзецьмі-сіротамі і ўдовамі з саслоўя гарадскіх абывацеляў. «Учреждения о губерниях» вызначалі іх склад, падпарадкаванасць. Асаблівая ўвага надавалася механізмам узаемадзення сіроцкіх судоў з апекунамі. Функцыянаванне сіроцкіх судоў, паводле закона, было аналагічным працы іншага саслоўнага інстытута апекавання, заснаванага ва «Учреждениях», – дваранскай апекі. Асобна прапісваліся правілы для саміх апекуноў, сугучныя з правіламі напісанымі для апекуноў, якія падпарадкоўваліся дваранскім апекам.

У заканадаўстве Расійскай імперыі канца XVIII – пачатку XIX ст. выразна прасочвалася тэндэнцыя да падзелу апекі над маёмасцю і апекі над асобай. Галоўнай мэтай дзейнасці сіроцкіх судоў было захаванне маёмасці, якая дасталася ўдовам і сіротам гарадскога саслоўя па спадчыне. Паводле закона, сіроты, якія не мелі маёмасці, аддаваліся ў дзіцячыя прытулкі або на выхаванне ў сем'і, а ўдовам без маёмасці апякун таксама не прызначаўся, прадастаўлялася праца або «пристанище и пропитание».

У першай палове XIX ст. быў прыняты шэраг законаў, які пашыраў сферу дзейнасці сіроцкіх судоў. Паводле іх, пад апеку сіроцкіх судоў патрапляла як секвестраваная маёмасць даўжнікоў з гарадскога саслоўя, так і гарадскія прадпрыемствы, адносна якіх узнікалі спрэчкі паміж спадкаемцамі. Акрамя таго, паўнамоцтвы сіроцкіх судоў былі пашыраны на дзяцей-сірот і ўдоў майстроў казённых фабрык і заводаў, якія знаходзіліся ў прыватным уладанні, а таксама асабістых дваран (катэгорыі дваранства, якая не перадавала саслоўныя правы па спадчыне) – у апошнім выпадку толькі на дзяцей, а не на іх маёмасць.

У кадыфікаваным «Зводзе законаў Расійскай імперыі» (рэдакцый 1835 г., 1842 г. і 1857 г. ) законы, якія тычыліся сіроцкіх судоў, былі напісаныя на аснове як «Учреждений о губерниях», так і пазнейшых указаў і ўвайшлі ў сямейнае права (агульныя з дваранскімі апекамі палажэнні пра апеку над непаўналетнімі, апекуноў і іх абавязкі) і дзяржаўнае (сіроцкія суды рабіліся часткай судовай сістэмы ў гарадах Расійскай імперыі).

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. Полное Собрание Законов Российской Империи (далей – ПСЗРИ): Собрание первое : [С 1649 по 12 декабря 1825 г. ]. СПб. : Тип. 2-го Отд-ния Собств. Е. И. В. канцелярии, 1830. Т. 20. С. 229–304. № 14392.

2. Свод законов Российской империи (далей – СЗРИ) [повелением Государя императора Николая Павловича составленный]. СПб, 1857. Т. 10. Ч. 1. Законы гражданские. 1857.

3. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 22. С. 358–384. № 16188.

4. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 26. С. 775–778. № 20004.

5. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 33. С. 464–465. № 26107.

6. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 38. С. 139–140. № 28986.

7. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 3. С. 53–54. № 1736.

8. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 7. С. 436–458. № 5464.

9. ПСЗРИ. Собр. 2. Т. 8. Ч. 1. С. 213. № 6106.

10. ПСЗРИ. Собр. 1. Т. 35. С. 220–222. № 27356.

11. СЗРИ. СПб, 1835–1836. Т. 10. Ч. 1. Законы гражданские. 1835.

12. СЗРИ. СПб, 1835–1836. Т. 2. Свод учреждений государственных и губернских. Ч. 2. Учреждения губернские. 1835.